**Падбярэзкая, Т.** Афганістан... Памяць назаўсёды / Т. Падбярэзкая // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2023. — 15 лют. — С. 4.

# АФГАНІСТАН... ПАМЯЦЬ НАЗАЎСЁДЫ

**Трыццаць чатыры гады таму савецкія войскі пакінулі Афганістан. Ваенная аперацыя, якая ішла больш за дзевяць гадоў, стала самым буйным па працягласці лакальным канфліктам пасля Вялікай Айчыннай вайны.**

Для тых, хто застаўся ў жывых, Афганістан – гэта боль і смутак, якія нічым не заглушыць. Мы шануем сваю гісторыю, ганарымся нашымі землякамі, воінамі-інтэрнацыяналістамі, якія дастойна вытрымалі ўсе выпрабаванні.

Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў для Дзмітрыя Разумовіча з Бягомля – асаблівы. Кожны год 15 лютага ў сваім двары ён вывешвае чырвоны сцяг як знак памятнай даты.

На службу ў Афганістан Дзмітрый Іванавіч прызваўся ў сакавіку 1981-га. Ужо тады ведаў, што бліжэйшыя два гады воінскі доўг трэба будзе выконваць на зямлі, дзе ідзе вайна.

– Пасля праходжання медкамісіі нас накіравалі спачатку ў Мар'іну Горку, а адтуль эшалонам у горад Тэрмез, што ва Узбекістане. Там на працягу двух месяцаў праходзілі паскораныя курсы маладога байца. Вучыліся страляць, прафесійна кідаць гранаты, кіраваць бронетранспарцёрам, а таксама выжываць у нязвыклым клімаце. У спякоту, якая пастаянна панавала ў гэтай азіяцкай краіне, вельмі хацелася піць. Таму, калі ўпершыню ўбачылі раку Амудар'ю, нават не сталі звяртаць увагу на тое, што вада ў ёй мутная, падобная на тую, што ў лужыне. Смагу наталілі ўдосталь, а на наступны дзень «зарабілі» сабе дызентэрыю.

Пасля ваеннай падрыхтоўкі Дзмітрыя разам з таварышамі накіравалі ў паўночны горад Афганістана – Кундуз. Там ён трапіў у разведку і быў прызначаны начальнікам радыёстанцыі.

– Жылі ў чыстым полі ў палатках і адначасова будавалі казарму, – працягвае афганец. – Але засяліцца так і не паспелі, бо адбыўся землятрус і жытло наша развалілася, як картачны дом. Прыйшлося будаваць нанова.

Дадому, гаворыць Дзмітрый, стараліся дасылаць толькі добрыя весткі і пазітыўныя фотаздымкі, каб лішні раз нехваляваць, не траўміраваць родных. Час ішоў, і вось яно – доўгачаканае вяртанне на радзіму. Моцныя абдымкі бацькоў, слёзы радасці і пачатак новага адрэзку жыцця – без вайны.

– Жадаю ўсім аднапалчанам моцнага здароўя, душэўных сустрэч і самае галоўнае – мірнага неба! – падкрэсліў у размове воін-інтэрнацыяналіст.

**Таццяна ПАДБЯРЭЗКАЯ.**